ЗАПАЗЫЧАНЫЯ НАЙМЕННІ Ў СКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

Д. А. Лаўшук (Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. А. Куляшова, г. Магілёў, Беларусь)

Адносіны да запазычаных найменняў у беларускай мове заўсёды былі неадназначныя. Многія даследчыкі лічаць запазычанні натуральнай з'явай, якая не толькі не парушае нацыянальнай самабытнасці беларускай мовы, але і з'яўляецца заканамерным шляхам узбагачэння яе слоўнікавага саставу [1, с. 12; 2, с. 34-35]. Некаторыя мовазнаўцы прытрымліваюцца думкі, што запазычанні магчымыя толькі пры адсутнасці ўласнамоўнай намінацыі: "Увядзенне ў літаратурную мову запазычанняў пры наяўнасці ўжо гатовага слова (вядомага ці ў народнадыялектнай, ці ў літаратурнай мове) – гэта недаравальная абыякавасць да роднай мовы, свядомае ці несвядомае збядненне і прыніжэнне роднай мовы" [10, с. 30].

Палярныя адносіны ўсталяваліся да запазычанняў тэрміналагічнага характару. Адны аўтары сцвярджаюць, што празмернае захапленне іншамоўнымі найменнямі на шкоду ўласнамоўным "часта прыводзіць не да ўзбагачэння тэрміналогіі, а да яе засмечвання" [7, с. 33]. Тэрміналогіі, насычаныя іншамоўнымі лексемамі, робяцца недаступнымі для неспецыялістаў. Іншыя лічаць ідэальнымі менавіта запазычаныя тэрміны, паколькі апошнія амаль заўсёды лаканічныя і не выклікаюць пабочных асацыяцый. Некаторыя

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

даследчыкі сярод іншых запазычанняў аддаюць перавагу грэка-лацінскім, падкрэсліваючы, што наяўнасць запазычанняў з іншых моў "нярэдка выклікае жаданне знайсці раўназначны эквівалент у роднай мове" [5, с. 10]. Але якія б ні існавалі меркаванні наконт мэтазгоднасці запазычанняў, ніводная галіновая тэрміналогія без іх не абыходзіцца, а ў радзе тэрмінасістэм (медыцынскай, хімічнай і інш.) іншамоўныя лексемы з'яўляюцца дамінуючымі. Крытэрыі мэтазгоднасці ўжывання таго ці іншага запазычанага тэрміна вызначаюцца "не яго паходжаннем, а ў адпаведнасці з патрабаваннем сістэматычнасці, лагічнай і моўнай абгрунтаванасці, кароткасці, словаўтваральнай прадуктыўнасці ..." [3, с. 10].

Як вядома, "на самым пачатку свядомай тэрмінатворчасці вызначальным у беларускай літаратурнай мове стаў прынцып максімальнага выкарыстання ўласных лексічных і словаўтваральных рэсурсаў пры мінімальным праяўленні прынцыпу арыентацыі на іншамоўныя тэрміны" [6, с. 11]. Але, зразумела, зусім адмовіцца ад запазычанняў было немагчыма, таму і сельскагаспадарчая тэрміналогія, дзе працэс назапашвання лексем адбываўся ў асноўным праз зварот да дыялектных слоў і стварэнне неалагізмаў на аснове агульнаўжывальнай лексікі, паступова, хоць і павольна, насычаецца тэрмінамі, запазычанымі з іншых моў. Арыентуючыся толькі на ўласныя моўныя сродкі, "немагчыма было ва ўмовах паскоранай тэрмінатворчасці беспамылкова вырашыць на практыцы праблему распрацоўкі нацыянальнай тэрміналогіі" [6, с. 14].

Іншамоўная лексіка ў сельскагаспадарчай тэрміналогіі пачатковага этапу фарміравання складае прыблізна 7,8%. Асаблівасцю ўвядзення некаторых запазычаных лексем у склад сельскагаспадарчай тэрміналогіі з'яўляецца той факт, што спачатку яны былі асвоены дыялектнай мовай, а ўжо з апошняй "мігрыравалі" ў тэрміналагічную сістэму. Напрыклад, лексічныя дыялектызмы з літоўскай мовы, як адзначае У.В. Анічэнка [1, с. 10], звычайна характэрны для народна-гутарковай мовы паўночна-заходняй тэрыторыі Беларусі (што пацвярджаецца зместам дыялектных слоўнікаў). А ўжо праз пасрэдніцтва народнай мовы імі ў 20-я гады папоўнілася і сельскагаспадарчая тэрміналогія: *клуня, пуня, свіран, сцірта, тарпа.*

На пачатковым этапе фарміравання нацыянальнай тэрміналогіі запазычваліся ў асноўным грэка-лацінскія назвы, што ўжываліся для абазначэння паняццяў самых розных галін сельскай гаспадаркі: *аграном, гумус, зоагігіена, інкубатар, інсэктысыды, калектар, меліярацыя, селекцыя, сепаратар, стэрылізацыя, суперфасфат, фунгіцыды* і інш. Такую папулярнасць грэка-лацінскіх запазычанняў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

можна растлумачыць тым, што яны ў найлепшай ступені забяспечвалі міжнародныя прафесійныя зносіны, да таго ж "... не належачы цяпер ні да якой жывой мовы, яны тым самым у роўнай ступені належаць усім" [9, с. 204]. Часам грэка-лацінскія лексемы запазычваліся не з самой мовы-крыніцы, а праз пасрэдніцтва іншых моў: польскай (*арэнда, індык, лубін, фасоля*), французскай (*інтэнсіфікацыя, культыватар, сорт, экстэр'ер*), англійскай (*кампост, трактар*), нямецкай (*цэнтрыфуга*).

Актыўна папаўнялася беларуская тэрміналогія і за кошт польскай мовы. З апошняй у сельскагаспадарчую тэрмінасістэму ўвайшлі не толькі паланізмы: *вантробы, маёнтак, свідар*, але і германізмы: *арфа, ворчык, грунт, дышаль, шынка, штых* і інш. Нямецкія тэрміны запазычваліся і непасрэдна з мовы-крыніцы: *стальвага, шрот, шуфель, паташ, флянсы*.

Працэнт запазычанняў з іншых заходнееўрапейскіх моў (акрамя нямецкай) на пачатковым этапе фарміравання сельскагаспадарчай тэрміналогіі быў адносна нязначным. Самую вялікую ў колькасных адносінах групу складалі французскія лексемы: *маркёр, метызацыя, пастэрызацыя, пікіроўка, пудрэт, сідэрацыя, трыер*. Менш актыўна запазычваліся тэрміны з англійскай (*глей, райграс*) і іспанскай (*мерынос, сырадэля, сілас*) моў. Для сельскагаспадарчай тэрміналогіі 20-х гадоў характэрныя і адзінкавыя запазычанні з турэцкай (*кавун, бугай*), італьянскай (*помідор*), татарскай (*кумыс*), персідскай (*баклажан*) моў. Паколькі некаторыя з запазычаных тэрмінаў толькі пачыналі "прыжывацца" ў нацыянальнай тэрміналогіі, то для лепшага іх разумення тагачасныя слоўнікі падавалі побач з імі ўласнамоўныя дублетныя лексемы: *гумус, перагной; маркёр, значнік; мерынос, шпанка; флянсы, саджанцы; экстэр'ер, склад цела*. Асноўная маса запазычанняў гэтага перыяду – простыя дэрываты, і толькі асобныя іншамоўныя па паходжанні тэрміны з'яўляюцца складанымі адзінкамі: *зоагігіена, тамасшлак, фітапаталогія*.

Такім чынам, у 20-я гады XX ст. іншамоўная лексіка складала адносна невялікую групу ў складзе сельскагаспадарчай тэрміналогіі. Гэта было абумоўлена тагачаснай тэндэнцыяй ствараць тэрміналагічныя сістэмы, абапіраючыся на ўнутрымоўныя структурна-семантычныя асаблівасці беларускай мовы. Але ўжо на пачатку 30-х гадоў пачынаецца актыўны працэс замены штучных новаўтварэнняў, створаных на аснове ўласнага моўнага матэрыялу, лексемамі, што трывала замацаваліся ў міжнароднай тэрміналогіі. У выніку гэтага ў сельскагаспадарчую тэрміналогію ўліваецца новы пласт іншамоўнай лексікі: *мяшанец – гібрыд, непарушнасць – імунітэт, ральніцтва – агракультура*. Аднак, як вядома, з'яўленне

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

іншамоўнай намінатыўнай адзінкі на любым участку семантычнай прасторы служыць, як правіла, імпульсам, што выклікае контрнамінацыю сродкамі мовы роднай. Таму ў канцы 40-х – пачатку 50-х гадоў мінулага стагоддзя зноў пачынаецца перыяд адмаўлення ад іншамоўных тэрмінаў і імкненне замяніць раней асвоеныя лексічныя запазычанні словамі нацыянальнай мовы: *бульдозер – трактарны адвал, грэйдэр – электронны плуг, скрэпер – трактарная лапата.* Спецыялісты-тэрмінолагі імкнуліся стварыць найменні, якія маглі б скласці канкурэнцыю запазычаным лексемам. Але ўжо з сярэдзіны 50-х гадоў працэс асваення іншамоўнай лексікі значна актывізуецца. Лексічныя запазычанні больш свабодна пачынаюць пранікаць у мовы ўсходніх славян. У сучаснай сельскагаспадарчай тэрміналогіі іншамоўныя дэрываты складаюць прыблізна 22,7% ад усёй колькасці аднаслоўных намінацый. Асабліва ўзрасла колькасць спецыяльных найменняў, утвораных на базе грэка-лацінскіх марфем (63,8 % ад усіх тэрмінаў іншамоўнага паходжання), прычым імі папоўніліся пераважна такія галіны сельскай гаспадаркі, як аграхімія, ветэрынарыя і фітапаталогія: *арнітоз, амідазтамоз, амафос, анаплазмоз, анафрадызм, антракноз, апрабацыя, атраканты, бактэрыёз, бісульфат, батрыямікоз, дэмадэкоз, дэпрэсія, дэсікацыя, імабілізацыя, інакуляцыя, ірыгацыя, кокамікоз, макраспарыёз, меланоз, ніграспарыёз, перанаспароз, персульфат, піядэрмія, пункцыя, рэвакцынацыя, рэтраінфекцыя, сапрапель, спірахетоз, тымпанія, тыёсульфаты, трамбідыёз, фагатэрапія, цэркаспароз, цыятастаматоз, энтэрацэнтоз* і інш. Многія з названых тэрмінаў уваходзяць у склад медыцынскай і хімічнай тэрмінасістэм. Тлумачыцца гэта цеснай сувяззю, што існуе паміж паняццямі хіміі і аграхіміі, медыцыны і ветэрынарыі. Папулярныя грэка-лацінскія асновы і пры ўтварэнні назваў розных прыбораў і прыстасаванняў, якія выкарыстоўваюцца ў той ці іншай галіне сельскай гаспадаркі: *аваскоп, амброграф, амброметр, атаскоп, афтальмаскоп, лактабутырометр, палярыметр, піранометр* і інш.

Сярод іншамоўных тэрмінаў, запазычаных з заходнееўрапейскіх моў, самую вялікую групу складаюць французскія лексемы: *баланс, грып, грэнаж, міраж, мазаіка* (фітапат.), *манеж, мінёр* (энт.), *пастэрызатар, піка, пулярка, рамонт, разетка, сідэрацыя, траншэя* (доўгі роў для захоўвання гародніны), *трыльяж* (тонкая агароджа для павойных раслін), *трыер, ферма, фрэза, фураж, эліта* і інш. Французская мова з'яўлялася пасрэдніцай пры пераходзе ў беларускую мову некаторых грэка-лацінскіх тэрмінаў: *база, вакцына, вібрыёз, доза, карбанаты, культыватар, магістраль, метыс, павільён, плантаж, секатар, транспарцёр, фумігацыя*; таксама

Электронный библиотека МГУ имени А.А. Кулешова

адзінкавых тэрмінаў з італьянскай (*брыгада*), арабскай (*магазін* (пчал.)), індзейскай (*тамат*) моў.

Крыху меншую групу ўтвараюць германізмы: *ванна* (тэх., заат.), *грэйфер, інцухт, рапс, трэнзель, фіноз, фланец, цапфа, шлейф* (тэх.), *шпат* (вет.), *шпора, штамб*, а таксама тэрміны, уведзеныя ў сельскагаспадарчую тэрміналогію пры пасрэдніцтве нямецкай мовы: *банітэт, статыстыка* (з лацінскай), *бункер* (з англійскай).

Павялічылася ў сучаснай тэрміналогіі і колькасць англіцызмаў: *аўтбрыдынг, бекрос, бойлер* (тэх.), *бройлер, брудэр* (тэх.), *віндроўэр* (тэх.), *інкросінг, канвеер, культывар* (агр.), *мульча, рыкетсіёзы* (вет.), *стрыпер, турнэпс, хескер-пікер* (тэх.), *хескер-шрэдэр* (тэх.), *чызель* (тэх.) і інш. Праз пасрэдніцтва англійскай мовы ў сельскагаспадарчую тэрміналогію ўліліся некаторыя тэхнічныя паняцці, утвораныя на аснове лацінскіх лексем: *скарыфікатар, экскаватар.*

Польская мова па-ранейшаму застаецца прадуктыўнай як пасрэдніца пры засваенні запазычанняў-германізмаў: *гурт, лейцы, цуглі*, а таксама тэрмінаў з іншых моў: *порцыя, салетра* (з лацінскай), *катар* (з грэчаскай), *кантар* (з венгерскай), *папуша* (з румынскай).

Запазычанні з іншых моў, як і на пачатковым этапе фарміравання нацыянальнай сельскагаспадарчай тэрміналогіі, не вызначаюцца высокай прадуктыўнасцю. Адзінкавыя тэрміны перайшлі ў беларускую мову з італьянскай (*бурат, пелагра*), галандскай (*кіль, цюк*), цюркскай (*саранча, таўро, чамбур*), турэцкай (*чапрак*), румынскай (*кашара*), татарскай (*біклага, табун, чабан*) моў.

Некаторыя тэрміны, замацаваныя ў сучаснай тэрміналогіі, з'яўляюцца кампазітамі, створанымі на базе запазычанняў з розных моў: *глебафрэза* (лац.+фр.), *камбісілас* (лац.+ісп.), *мульчкультура* (англ.+лац.), *тамасшлак* (англ.+ням.), *торфабрыкет* (ням.+фр.), *торфакампост* (ням.+англ.), *электрабрудэр* (гр.+англ.), *электрафрэза* (гр.+фр.) і інш. Пры ўтварэнні складаных найменняў іншамоўныя асновы могуць спалучацца і з усходнеславянскімі: *авіяапрацоўка, аўтадаенне, геасяўба, гідразмыў, глебаразрыхляльнік, мотаплуг, мульчсалома, сіласанапаўняльнік, электрапастух* і мн. інш.

Прадуктыўныя іншамоўныя дэрываты і пры ўтварэнні больш складаных у структурным плане найменняў, напрыклад так званых тэрмінаў-прыдаткаў: *грэйдэр-элеватар* (англ.+лац.), *інцухт-дэпрэсія* (ням.+лац.), *метыс-гібрыд* (фр. ад п.-лац.+лац. ад гр.), *сорт-клон* (фр. ад лац.+гр.), *торф-мелес* (ням.+фр.), *транспарцёр-элеватар* (фр. ад лац.+лац.) і інш. У якасці прыдатка могуць выступаць і ўласнабеларускія лексемы: *дыск-акучнік, скрэпер-валакуша.* Пра высокую тэрмінаўтваральную актыўнасць запазычаных лексем сведчыць і распаўсюджанае ў сельскагаспадарчай тэрміналогіі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

штучнае ўтварэнне найменняў на аснове іншамоўных каранёў па словаўтваральных мадэлях беларускай мовы: *бурт – буртаванне, буртаўшчык; гумус – гумуснасць, гуміраванне; доза – дазатар, дазіраванне, дазіроўка; сілас – сіласаванне, сіласавальнасць* і інш.

Такім чынам, запазычанне найменняў з іншых моў з`яўляецца невычэрпнай крыніцай узбагачэння сельскагаспадарчай тэрмінасістэмы, а ў тэрміналогіі ветэрынарыі, фітапаталогіі і аграхіміі найменні, утвораныя на аснове грэка-лацінскіх тэрмінаэлементаў, складаюць абсалютную большасць. Прыналежнасць спецыяльных найменняў да іншамоўнай лексікі ніяк не ўплывае на іх словаўтваральныя магчымасці.

1. Анічэнка, У.В. Запазычаная лексіка ўсходнеславянскіх моў у савецкую эпоху / У.В. Анічэнка // Беларус. мова. Вып. 5 / М-ва вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі БССР. Гомел. дзярж. ун-т. – Мінск: Выдавецтва Беларус. дзярж. ун-та імя У.І. Леніна, 1977. – С. 3-12.
2. Багамаз, Л.Р. Лексіка італьянскага паходжання ў беларускай мове / Л.Р. Багамаз // Беларус. мова. Вып. 5 / М-ва вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі БССР. Гомел. дзярж. ун-т. – Мінск: Выд-ва Беларус. дзярж. ун-та імя У.І. Леніна, 1977. – С. 34-40.
3. Бархударов, С.Г. О значении и задачах научных исследований в области терминологии / С.Г. Бархударов // Лингвистические проблемы научно-технической терминологии; редкол.: С.Г. Бархударов (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1970. – С. 7-10.
4. Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: у 2-х т. / А.М. Булыка. – Мінск: Беларус. энцыкл., 1999. – 2 т.
5. Даниленко, В.П. Лингвистические требования к стандартизированной терминологии / В.П. Даниленко // Терминология и норма: О языке терминологических стандартов / АН СССР. Ин-т русск. языка; отв. ред. В.П. Даниленко. – М.: Наука, 1972. – С. 5-32.
6. Красней, В.П. Некаторыя асаблівасці беларускай навуковай тэрміналогіі нашаніўскага перыяду і 20-х гадоў / В.П. Красней // Весн. Беларус. дзярж.ун-та. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 1994. – №2. – С. 30-35.
7. Лотте, Д.С. Основы построения научно-технической терминологии: вопросы теории и методики / Д.С. Лотте // АН СССР. Комитет технической терминологии. – М.: Изд-во АН СССР, 1961. – 158 с.
8. Руска-беларускі слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі / Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі; пад рэд. М.В. Бірылы, Г.У. Арашонкавай. – Мінск: Ураджай, 1994. – 560 с.
9. Суперанская, А.В. Общая терминология: вопросы теории / А.В. Суперанская, Н.В. Подольская, Н.В. Васильева // Ин-т языкознания АН СССР; отв. ред. Т.Л. Канделаки. – М.: Наука, 1989. – 246 с.
10. Янкоўскі, Ф. Роднае слова / Ф. Янкоўскі. – Мінск: Вышэйшая школа, 1967. – 92 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова